*ЛІТАРАТУРНЫЯ СУСТРЭЧЫ*

1 снежня 2015 года ў рамках Тыдня беларускай мовы і літаратуры адбылася творчая сустрэча вучняў старэйшых класаў СШ №37 з старшым выкладчыкам кафедры беларускай літаратуры ГрДУ ім. Я.Купалы, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Святланай Мікалаеўнай Тарасавай, а таксама студэнтамі філалагічнага факультэта, маладымі гарадзенскімі паэтэсамі Вікторыяй Смолка і Алінай Паўлоўскай.

Госці пазнаёмілі навучэнцаў са сваёй творчасцю, змаглі прыцягнуць увагу слухачоў непасрэднасцю і шчырасцю свайго паэтычнага слова. Стварэнню паэтычнай атмасферы спрыяла музычнае суправаджэнне на цымбалах у выкананні навучэнкі гэтай жа школы.

ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА

***На здымках:*** падчас літаратурнай сустрэчы у СШ № 37 г. Гродна 1 снежня 2015 года.





Перад школьнікамі выступае паэтэса Аліна Паўлоўская





Маладая паэтэса Вікторыя Смолка



Старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры ГрДУ імя Я.Купалы, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Святлана Мікалаеўна Тарасава